Артур
ВОЛЬСКІ

# ХЛЕБ-
# усяму галава



Артур Вольскі

# ХЛЕБ — усяму галава





Артур
ВОЛЬСКІ

# ХЛЕБ–
# усяму галава

Расказ-эсэ



Мінск
«Юнацтва»
1989

ББК84Бел7
В67

В новой книжке известного белорусского писателя рассказывается о нелегком труде хлебороба, о том, сколько труда вкладывают люди разных профессий, чтобы хлеб пришел к нам на стол. Хлеб — это наше богатство, и относиться к нему надо бережно.

Мастак В. ТАРАСАЎ

В $\frac{4803120201-111}{М307(03)-89}$ 54—89

ISBN 5-7880-0182-X

© Выдавецтва «Юнацтва», 1989



*Спрадвеку*
*Чалавеку*
*хлеб*
*Адной з найпершых*
*Быў патрэб.*
*Народ назваў,*
*відаць, таму*
*Хлеб*
*галавою*
*усяму.*






Некалі, яшчэ ў маленстве, чуў я пра хлопчыка, які думаў, што хлеб на дрэвах расце. Як яблыкі, грушы, слівы. Прыходзіш у хлебны сад, а галіны пад важкімі пладамі ледзь не да зямлі гнуцца. І водар навокал! Аж слінкі бягуць. Вось чорныя боханы. Вось сітныя с бліскучай залацістай скарынкай. Прадаўгаватыя батоны, круглыя плеценыя булкі, блізкія колерам да сонца. А вось і здоба. Салодкая, пахкая, з разынкамі, з марцыпанамі, з павідлам... Падыходзь да любога дрэва, ірві, што больш табе да густу, каштуй, смакуй, еш уволю...

А сёння хіба знойдзеш хлопчыка ці дзяўчынку, якія паверылі б у такія казкі? Хлеб —

на дрэвах... Яшчэ чаго! Цяпер усе ведаюць, што хлеб у магазіны, сталоўкі, буфеты кожную раніцу спецыяльныя аўтафургоны прывозяць. З пякарняў, хлебазаводаў. На аўтафургонах вялікімі літарамі так і напісана: ХЛЕБ.

Бяжыць па вуліцы фургон.
Куды шафёр спяшаецца?
У магазін павінен ён
Даставіць хлеб да раніцы.
Той хлеб увішны хлебапёк
Нам у начную змену спёк...

Давай паспрабуем уявіць сабе, што раптам паламаўся ў дарозе аўтафургон з хлебам. Ці ў пякарні нешта здарылася. І не трапіў хлеб своечасова на паліцы магазінаў, у сталоўкі, у дзіцячы садок. І давялося цэлы дзень есці розныя стравы без хлеба, без булкі. Спачатку, можа, нават і ўвагі не звернеш. Ат, падумаеш. І без хлеба абыдземся. Але неўзабаве заўважыш, што большасць страў без хлеба зусім не той смак маюць. І назаўтра такім смачным хлеб табе здасца! Хоць чорны, хоць белы...

Без хлеба —
Яда не яда.
А з хлебам —
Усмак і вада.

Я ў гэтым не раз у жыцці пераконваўся.

Даўно гэта было. Галаднавата жылі мы тады. Хлеб — па картках. Ды і то не ўволю, а каму колькі на дзень пакладзена. І толькі чорны. Іншых прадуктаў таксама не хапала. Ох, якою смачнаю здавалася мне тады зацірка ў суседкі па кватэры цёткі Агафы! Зацірку тую і без хлеба есці можна было. Яна ж з дробненькімі камячкамі цеста. Ды яшчэ малаком крыху забеленая...

Аднаго разу дала мне маці хлебныя карткі і паслала ў краму.

— Глядзі, карткі не згубі,— папярэдзіла яна,— бо да канца месяца без хлеба застанемся...

Прадаўшчыца адарвала колькі трэба талончыкаў. Вярнула мне карткі. Хлеб падала. Аж паўтара бохана. Іду я дадому. А так хочацца адшчыкнуць хоць трошачкі ад той палавінкі!

Але цярплю, трываю. Гэта ж на ўсю сям'ю нашу, на чатыры чалавекі. І не на адзін дзень...




Раптам бачу — сядзіць ля сцяны нашага дома жанчына з двума дзецьмі. Дзяўчынкай і хлопчыкам. Яна крыху старэйшая за мяне. Ён — меншы. Усе трое запыленыя, у падраным адзенні. Я адразу здагадаўся: яны з тых краёў, дзе яшчэ галадней, чым у нас. Тады многія на Беларусь падаліся, ратунку ад голаду шукаючы. У нас жа хоць бульба была...

Хлопчык глядзеў на хлеб у маіх руках, і столькі пакуты было ў яго вачах, што я не вытрываў. Падышоў і працягнуў тую палавінку, ад якой так і не асмеліўся адшчыкнуць сабе. Ён спачатку разгубіўся. Потым ухапіў хлеб сваімі бруднымі ручкамі і да рота паднёс. Але спахапіўся. Аддаў маме. А ў самога на вейках


ХЛЕБ
ХЛЕБ

слёзы. Жанчына ўзяла хлеб. Адламала сыну кавалак, потым дачцэ. Астатняе за пазуху схавала. Я адчуў, што і сам вось-вось заплачу. Павярнуўся, пабег. А ўслед пачуў знаёмыя словы на незнаёмай мове:

— Спасыбі, сынку!..

Пазней даведаўся, што гэта яна сказала па-ўкраінску.

Дома мама накінулася на мяне:

— Чаму так мала прынёс? Абдурылі! Абдурылі малога...

Я, глытаючы слёзы крыўды, расказаў усё чыста, як было. Тады яна прытуліла мяне да сябе і сама заплакала.

З таго часу не магу спакойна глядзець, як некаторыя людзі марна хлеб пераводзяць. Набяруць у краме больш чым трэба, а потым выкідаюць. Або, як у школьнай сталоўцы бачыў неяк, дзеці рэшткамі хлеба адзін у аднаго шпурлялі.

Так і карцела падысці і сказаць:

— А ці ведаеш ты, якою працаю хлеб здабываецца?..

Хлеб — вялікае багацце.
Хлебам слаўны родны край.
У сталоўцы, ў школе, ў хаце
Хлеб цані і паважай!

Так, хлеб не толькі берагчы, але і паважаць трэба. У даўнейшыя часы, бывала, як канчала сям'я палуднаваць, старэйшы змахваў са стала хлебныя крошкі сабе на далонь і — у рот. Каб нават з макавае зернетка дарма не прапала. Калі ж хто-небудзь, седзячы за сталом, выпадкова выпускаў лусту хлеба з рук, дык паднімаў яе з падлогі, абдзьмухваў з усіх бакоў і казаў:

— Даруй, бацюхна хлеб!

Вось як!

А цяпер? Цяпер бывае і такое:

Тры хлапчукі ў глухім завулку,
Нібы гуляючы ў футбол,
Туды-сюды ганялі булку
І заганялі ёю гол.

Праходзіў дзядзька незнаёмы,
Спыніўся, з сумам уздыхнуў



І ля агромністага дома
Руку да булкі працягнуў.

Насуплены, зусім сярдзіты,
Ён доўга пыл з яе страсаў,
А потым шчыра і адкрыта
Пры ўсіх яе пацалаваў...

І патыхнула ўмомант хлебам
І цеплынёй таемнай той,
Што дорацць нам пад мірным небам
Палі пшаніцы залатой.

Гэты верш напісаў вядомы рускі паэт Сяргей Міхалкоў.

Гляджу на хлеб. Удыхаю яго непаўторны дух. А перад вачамі ўзнікае поле. Шырокае. Прасторнае. І жыта ў полі. Або пшаніца. Весела перазвоньваюцца каласы пад ветрам. Быццам незлічоныя залатыя званочкі...

Але гэта — пад канец лета. Калі даспела збожжа. Калі вось-вось жніво пачнецца. Таму апошні летні месяц і мае такую назву — жнівень.

А колькі працы чалавечай укладзена ў поле,

у зямлю, каб узяць багаты ўраджай! Каб усе мы з хлебам былі і да хлеба мелі. Бо ў полі вырошчваюць збожжавыя не толькі на хлеб людзям, але і жывёле на корм. На фураж, значыцца. А без корму, без фуражу, ні малака, ні мяса, ні многіх іншых прадуктаў не было б...

Нават узімку, калі, здаецца, моцна спяць палеткі і сняць свае белыя сны, няма супакою рупнаму хлебаробу. Добра, калі снег своечасова выпаў, укрыўшы поле пульхнай пуховай коўдрай. Цёпла будзе пад ёю азімым, не вымерзнуць. Што такое азімыя? Гэта жыта, пшаніца, ячмень, якія высяваюць увосень. Яны зімуюць, набіраюцца сілы пад снегам, а пасля ўжо, улетку, спеюць. А што, як мала снегу ды маразы лютыя? Тады і да бяды недалёка. Вымерзнуць можа азіміна. Не лепей, калі і занадта цёплая зіма. Калі адліга за адлігай. А замест снегу дожджык сыпле. Вымакне ўсё, што пасеяна з восені, пагніе...

І за ўсім гэтым сачыць трэба. Пільна сачыць. Каб усё прадугледзець. Каб тыя палеткі, дзе вымерзла азіміна ці пагніла, нанова перасеяць.

А яшчэ трэба паклапаціцца, каб снег не адразу з ручайкамі ў рэчкі сплыў. Каб павольна сыходзіў. Тады адталая вада ў глебу ўсмокчацца. Напоіць удосталь раслінкі. І яны, прыгрэтыя вясновым сонцам, хутчэй угару пацягнуцца. Паглядзіць хлебароб на зазелянелыя ўсходы асенніх пасеваў і скажа задаволена:

— Бач, як рунь узнялася! З ураджаем будзем...

І за сяўбу яравых возьмецца. А яравыя, ці ярына,— гэта жыта, пшаніца, авёс, якія ўвесну сеюць. Улетку збожжа расце, а пад восень даспявае.

Улетку таксама нямала ад прыроды, ад надвор'я залежыць. Не на карысць раслінам, калі зарадзіць дождж надоўга. Няма дажджу — таксама не на карысць. Гарачыня. Спякота. Перасыхае зямля. Не хапае раслінам вільгаці. Трэба выводзіць на палі палівальныя ўстаноўкі, рабіць штучны дождж.

Можа на расліны і хвароба якая напасці. Як на жывую істоту. І гэта трэба ў час прыкмеціць. Меры прыняць. Можа, нават хімічныя сродкі ўжыць. Але яны рэкі забруджваюць, рыбу

труцяць, птушак губяць. А птушкі — яны ж таксама хлебаробу памагаюць. Шкоднікаў розных нішчаць: казурак, насякомых. Вось і думай, мяркуй, як раслінам памагчы і прыродзе не нашкодзіць.

Але вось нарэшце даспела збажына. Шчыльнай сцяной, у рост дарослага чалавека, стаіць жыта. Сама назва гэтай расліны пра сябе гаворыць: жыта — жыццё. Блізкія словы. Пшаніца — тая крыху ніжэйшая. Але ты ў ёй з галавой схаваешся. І жыта і пшаніца галоўным чынам на хлеб ідуць. З жытняй мукі чорны хлеб пякуць. З пшанічнай — белы. А вунь авёс. Ростам ён яшчэ ніжэйшы за пшаніцу. І колас у яго не тугі, а развесісты. Затое вусы-асцюкі — ух якія калючыя! З аўса «геркулес» робяць. А каша з «геркулесу» і смачная і карысная. Хто есць яе, той расце, як кажуць, не па днях, а па гадзінах і сілы хутка набіраецца.

Выйшаў хлебароб у поле, узяў на далонь каласок. Расцёр яго. Здзьмуў пыл ды труху. І на далоні зазалаціліся тугія, крамяныя зярняткі.





— Сярпа просяць,— усміхнуўся сам сабе хлебароб.

Пра серп — гэта ён так, па старой звычцы ўспомніў. Хіба з сярпом управішся з такім шырокім полем? Тут тэхніка сучасная патрэбна. А жніво пачынаць і сапраўды самы час. Спознішся — пераспее збожжа. Сцябло паламаецца. Зерне асыпáцца пачне з каласкоў...

І выходзяць у поле камбайны.

Гляджу я на гэтыя магутныя машыны, і ўяўляюцца яны мне караблямі. А поле — морам. Толькі хвалі ў моры сінія, блакітныя, зялёныя. А тут адзін колер — жоўты. Ад краю да краю.

Можа, таму мне поле морам здаецца, што сам я некалі на флоце служыў. На баявым караблі. Боцманам.

Ішла вайна. Крывавая. Бязлітасная. Народ рабіў усё, каб адолець ненавіснага ворага. Амаль усе мужчыны ў армію пайшлі. Многія дзяўчаты таксама за зброю ўзяліся. У гарадах, у вёсках толькі старыя ды дзеці засталіся. А нам, ваенным маракам, штодня на сняданак па ладнай лусце белага хлеба выдавалі. З невялікім кубі-



кам масла. Які гэта быў хлеб! Пульхны, смачны. З ім нават кампот, які нам давалі ў абед на трэцяе, не мог раўняцца. І так мы былі ўдзячны тым, хто ў гэты грозны час засяваў палі, збіраў ураджай, выпякаў такі цудоўны хлеб! Самі ж яны недаядалі, недасыпалі. Толькі б забяспечыць абаронцаў Радзімы ўсім неабходным для перамогі...

Плывуць камбайны па полі. Як караблі па моры. Залатым струменем сыплецца збожжа ў кузавы грузавых аўтамашын...

Грузавік —
працаўнік,
ленавацца не прывык.
— Што ён зараз возіць?
— Збожжа!
У гарачцы жніўных дзён
хто камбайну дапаможа,
як не ён?

І вадзіцель
зухавата

паглядзеў на небакрай:
— Хмарка, хмарка,
пралятай!
Хмарка,
не перашкаджай!
Трэба нам
на элеватар
звезці ў тэрмін
ураджай...

І праўда. Толькі б залева не лінула. Толькі б град не пабіў збажыну. Бо тады ох як цяжка будзе сабраць з поля ўсё, што вырашчана...

Бягуць аўтамашыны з прычэпамі. Вязуць на элеватар збожжа. Ссыпаюць яго там і назад спяшаюцца. За новай порцыяй. А на элеватары збожжа правеюць, падсушаць і пакінуць на захаванне. Элеватар — гэта ж і ёсць вялізнае збожжасховішча. Адсюль жыта і пшаніцу адправяць на млыны, на мукамольныя заводы, камбінаты. Там іх змелюць на муку. А мука ўжо на хлебазаводы, у пякарні трапіць. І спякуць з яе хлеб. Самых розных гатункаў...



Думаю пра гэта і верш успамінаю. Свой уласны.

Дзякуй глебе,
што кожнае зернетка сокам,
нібы маці грудзямі,
ўскарміла, ўспаіла.
Дзякуй сонцу,
што ў небе
хадзіла высока
і сцяблам аддавала
праменную сілу.
Дзякуй цёплым дажджам
і лагоднай расе
за жыты,
што ўзраслі
ў жыццядайнай красе.
Дзякуй рупным рукам,
што заўжды ў мазалях,
без якіх каласам
не звінець у палях!

Хораша пахне ў хлебнай краме. Асабліва калі толькі-толькі свежыя боханы і булкі з пя-

карні прывязуць. Мне гэты пах навявае далёкія-далёкія ўспаміны...

Доўгі час наша Беларусь была падзелена на дзве палавіны. Адна — Усходняя, савецкая. Другая — Заходняя — пасля грамадзянскай вайны пад панскай Польшчай засталася. Але вось надышоў той шчаслівы дзень, калі Заходняя Беларусь стала таксама савецкай. Як радавалася мая мама! Яна дваццаць гадоў не бачыла сваіх бацькоў. Жылі яны ў невялікім мястэчку Рубяжэвічы, па той бок граніцы. Радаваўся і я. Цяпер і ў мяне ёсць дзядуля і бабуля. Як у іншых. Татавы бацькі адразу пасля рэвалюцыі памерлі. Ад голаду. У Петраградзе. Так тады Ленінград называўся.

Летам я з мамай паехаў у Рубяжэвічы.

Жылі бабуля з дзядулем на гразкай вясковай вуліцы. У скасавуранай ад часу хаціне. Пайшоў я аднойчы да іх. Яшчэ з двара чую незвычайна смачны хлебны дух. Значыцца, бабуля хлеб пячэ. А пра яе майстэрства ў гэтай справе мама мая не раз успамінала. Яшчэ тады, калі нас з яе бацькамі дзяржаўная граніца падзяляла і мы пра лёс іх нічога не ведалі.

Уваходжу ў хату. А тут заўсёды як у прыцемках. Бо вокны маленькія, шыбкі не дужа празрыстыя. Агледзеўся. Аж праўда, бабуля пры печы завіхаецца. Бярэ з балеі акуратна выкладзены з цеста круглы і зусім яшчэ белы бохан. На шырокую драўляную лапату кладзе. У печ суне. А з печы так гарачынёю і патыхае. Як след напалена. Але не тое каб галавешкі, ніводнага вугольчыка не відаць. Под чысцютка вымецены і аерам усланы. На гэты аер і стаўляе бабуля будучыя боханы.

Вось бохан паружавеў ужо. Скарынка пачала ўтварацца. Тады бабуля зноў выцягвае яго на прыпечак. Мочыць рукі ў вадзе. Асцярожна абгладжвае мокрымі рукамі верхнюю скарынку. Зноў у печ суне...

А на стале, на льняным абрусе, красуюцца ўжо некалькі свежанькіх боханаў. Верхняя скарынка ў іх залацістая, з цёмнымі кропачкамі кмену. Ніжняя — белая, мучністая. Такі хлеб сітным завецца ці сітніцай. Пякуць яго з жытняй мукі, прасеянай праз сіта.

Дзядуля глядзіць на мяне лагоднымі вачыма. Моўчкі адкройвае ад свежага бохана ладны



акраец. Налівае малака са збанка ў кубачак. Паказвае мне: частуйся, унучак. І ўсё моўчкі. Бо гаварыць ён не ўмее. Глуханямы. З маленства. А знакаў яго на пальцах я, на жаль, не разумею...

Бабуля таксама прысела каля дзеда. Абое сівенькія. А вочы пяшчотныя-пяшчотныя...

Ніколі ў жыцці не еў я хлеба, смачнейшага за бабульчын. З ім хіба толькі той параўнацца мог, што нам у вайну на караблі давалі...

Тая вайна многіх людзей пабрала. Не стала і маіх бабулі з дзядулем. Хто кажа, што фашысты расстралялі іх. Хто — што жыўцом у зямлю закапалі...

Шмат гадоў прамінула з тых часоў. Цяпер хлеба ў нас уволю. Прыходзь у магазін, выбірай, што больш да смаку. Чорны, амаль як зямля на палетку, вялікі круглы бохан «Раўбіцкага». Так ён завецца таму, што некалі падобныя боханы ў Раўбічах, пад Мінскам, сяляне выпякалі. Таксама чорны, але з карычневым адценнем — «Барадзінскі». Ён сваю назву ўзяў ад Барадзіна, што



на Смаленшчыне. Крыху святлейшы — «Украінскі». Яшчэ святлейшы — «Кішынёўскі». Далей — булкі белыя, батоны. А вось і здоба...

Выбар вялікі. Спажывай, што хочаш. Адно толькі нагадаць хачу:

Чорны, белы хлеб ці здобу
еш, але не забывай
быць удзячным хлебаробу,
што вырошчваў ураджай!



Издание для детей и юношества

**ВОЛЬСКИЙ Артур Витальевич**

**ХЛЕБ — ВСЕМУ ГОЛОВА**

**Рассказ-эссе**

*Для дошкольного возраста*

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Выданне для дзяцей і юнацтва

**ВОЛЬСКІ Артур Вітальевіч**

**ХЛЕБ — УСЯМУ ГАЛАВА**

**Расказ-эсэ**

Загадчык рэдакцыі У. І. Карызна
Рэдактар Н. І. Міронччык
Малодшы рэдактар Н. А. Грышкова
Мастацкі рэдактар А. У. Ружо
Тэхнічны рэдактар С. А. Абрамчук
Карэктар І. П. Васілеўская

ІБ № 1195

Здадзена ў набор 04.01.89. Падпісана да друку 29.06.89. Фармат $70 \times 84^{1}/_{16}$. Папера афс. № 2. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 2,18. Ум. фарб.-адб. 9,27. Ул.-выд. арк. 1,03. Тыраж 40 000 экз. Зак. 1. Цана 10 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

10 к.

